Навукова-метадычная ўстанова
“Нацыянальны інстытут адукацыі”
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

# ВАКАЛЬНЫ АНСАМБЛЬ (ФАЛЬКЛОРНЫ)

**Праграма**

**факультатыўных заняткаў**

для V-IX класаў установаў агульнай сярэдняй адукацыі

Скачено с Образовательного портала www.adu.by

## Тлумачальная запіска

Фальклор займаў і займае важнае месца ў духоўным жыцці народа. Цяжка перааацаніць яго грамадска-палітычнае, эстэтычнае і выхаваўчае значэнне на ўсіх этапах развіцця грамадства. Народная вусная паэтычная творчасць вучыць палымяна любіць сваю Радзіму, садзейнічае выхаванню лепшых якасцей чалавека: імкнення да свабоды, павагі да людзей, працавітасці, справядлівасці, сумленнасці, выхоўвае пачуццё прыгожага на лепшых узорах створанага народам мастацтва. Народная творчасць – адна з жыватворных крыніц развіцця нацыянальнага прагрэсіўнага мастацтва, якая ахоплівае розныя праявы народнай культуры, у тым ліку вакальную, вакальна-інструментальную, харэаграфічную, драматычную. Таму далучэнне дзяцей да народнай песні набывае ў цяперашні час асаблівую актуальнасць.

Фальклору адводзіцца значная роля ў справе духоўнага і эстэтычнага выхавання дзяцей. Вакальнае (фальклорнае) навучанне заўсёды адбываецца ў межах традыцыі, апіраецца на папярэдні вопыт і выкарыстоўвае назапашаныя мастацкія каштоўнасці, якія належаць усяму народу. Сацыяльныя функцыі дзіцячага фальклору – пазнавальная, выхаваўчая, эстэтычная, камунікатыўная – не толькі аб’ядноўваюць у адзіную сістэму ўсе яго жанры, але з’яўляюцца тым фактарам, які яднае дзіцячы фальклор з усімі відамі народнай творчасці, створанай дарослымі для дзяцей, і творчасць саміх дзяцей.

**Мэта факультатыўных заняткаў:** далучэнне вучняў да гісторыі і культуры свайго народа, стымуляванне роста іх духоўнасці праз уключэнне ў традыцыйную народную вакальную дзейнасць.

**З а д а ч ы** :

- развіццё вакальных, слыхавых і вакальна-ансамблевых навыкаў;
- вывучэнне і выкананне высокамастацкага рэпертуару, featuring рознабаковага па зместу і жанрах;
- набыццё практычных навыкаў канцэртна-выканальніцкай дзейнасці;
- выхаванне музычна-эстэтычнай культуры сродкамі вакальнага мастацтва;

Скачено с Образовательного портала www.adu.by

- выхаванне творчай актыўнасці.

Асаблівасці будовы праграмы звязаны з працэсам засваення вучнямі спецыфікі народна-песеннай мовы, яе інтанацыйна-ладавых і метрарытмічных асаблівасцяў.

Характар вучэбна-выхаваўчага працэса абумоўлены фальклорным рэпертуарам, формамі і тэхнікамі яго канцэртна-сцэнічнага ўвасаблення. Рэпертуар выконвае функцыі духоўна-эстэтычнага выхавання, улічваючы неабходнасць захавання тэматычнай, стылістычнай і жанравай разнастайнасці. Пры гэтым павінны выконвацца прынцыпы ад простага к складанаму, паступовасці і паслядоўнасці ў авалодванні тэхнічных навыкаў выканная і развіцці творчых здольнасцей дзяцей. Акрамя народных песен у рэпертуар вакальнага ансамбля (фальклорнага) уключаюцца апрацоўкі беларускіх народных песен і аўтарскія творы, якія стылістычна блізкія народнай музыцы.

Пры навучанні фальклорнаму ансамблю выкарыстоўваюцца групавыя практычныя заняткі. Пры гэтым акцэнт робіцца на індывідуальны падыход. Тлумачальна-ілюстратыўны і рэпрадуктыўны метады – аснова практычнага засваення спеваў.

На працягу навучальнага перыяду плануецца рад творчых выступаў: адкрытыя ўрокі, справаздачныя канцэрты, выступленні ў зборных канцэртах і мерапрыемствах. У гэтым выкладчыкам дапаможа зборнік “Наша спадчына”.

Вынікам работы ў кожным класе з’яўляецца вывучэнне 6-8 твораў лепшых узораў народных песен з невялікім дыяпазонам гучання (абавязкова як у павольным, так і ў хуткім тэмпе). Пасля кожнага паўгоддзя праводзяцца кантрольныя ўрокі. У канцы года праводзяцца справаздачныя урокі-канцэрты.

Пры падборы рэпертуару неабходна ўлічваць тэмбральную афарбоўку голасу вучняў, дыяпазон і здольнасці, каб падабраныя творы былі не вельмі складаныя. Значная ўвага пры рабоце над творамі надаецца раскрыццю драматургічнага вобразу музычнага твору.

Скачено с Образовательного портала www.adu.by

**Прыкладны тэматычны план.**

| № п/п | Назвы тэм | Колькасць гадзін | |
|---|---|---|---|
| | | тэарэ-тычныя | практыч-ныя |
| **V клас** | | | |
| 1. | Песні зімовага перыяда земляробчага календара (калядкі, шчадроўкі) | 2 | 9 |
| 2. | Веснавы перыяд беларускага земляробчага календара (вяснянкі, валачобныя песні, Юр'я) | 2 | 9 |
| 3. | Пазаабрадавая паэзія (жартоўныя песні) | 1 | 5 |
| 4. | Казкі, загадкі. | 4 | 2 |
| **Усяго:** | **34** | **9** | **25** |
| **VI класс** | | | |
| 5. | Калядныя песні (калядкі, масленка) | 1 | 7 |
| 6. | Веснавы перыяд земляробчага календара (веснавыя карагоды, карагодныя песні) | 2 | 9 |
| 7. | Летні перыяд земляробчага календара (Купалле) | 2 | 9 |
| 8. | Прыказкі і прымаўкі | 2 | 2 |
| **Усяго:** | **34** | **7** | **27** |
| **VII класс** | | | |
| 9. | Веснавы перыяд земляробчага календара (траецкія і русальныя песні) | 1 | 10 |
| 10. | Летні перыяд земляробчага календара (пятроўскія песні, жніўныя песні – зажынкі) | 1 | 10 |
| 11. | Пазаабрадавая паэзія (гістарычныя і баладныя песні) | 1 | 5 |
| 12. | Легенды і паданні | 2 | 4 |
| **Усяго:** | **34** | **5** | **29** |
| **VIII класс** | | | |
| 13. | Пазаабрадавая паэзія (рэкрутскія і жартоўныя песні) | 1 | 8 |
| 14. | Прыпеўкі | 1 | 6 |
| 15. | Летні перыяд земляробчага календара (жніўныя песні) | 2 | 10 |
| 16. | Замовы | 4 | 2 |
| **Усяго:** | **34** | **8** | **26** |
| **IX класс** | | | |

Скачено с Образовательного портала www.adu.by

| | | | |
|---|---|---|---|
| 17. | Асенні перыяд земляробчага календара (талочныя, ільняныя песні) | 1 | 7 |
| 18. | Народны тэатр (лялькавы тэатр “Батлейка”) | 1 | 7 |
| 19. | Сямейна-абрадавая паэзія (велічальныя хрэсьбінскія і жартоўныя песні) | 1 | 7 |
| 20. | Пазаабрадавая паэзія (сямейна-бытавыя песні) | 1 | 9 |
| **Усяго:** | **34** | **4** | **30** |

## ЗМЕСТ

### V клас.

Тэма 1. *Песні зімовага перыяда земляробчага календара (калядкі, шчадроўкі).*

Традыцыі, асвечаныя стагоддзямі. Працоўна-магічная аснова характэрных праяў земляроба. Тыпавыя калядкі (велічальныя гаспадару, гаспадыні, дачцэ (паненцы) і сыну (панічу, хлопцу). Асноўны сэнс калядак. Сюжэт трох гасцей (весел месячык, жарка сонейка і дробен дожджык) у шчадроўскіх песнях. Дзеючыя асобы каляднага абраду: каза, журавель, кабыла, мядзведзь, механоша.

Жартоўныя песні ў калядным абрадзе.

Тэма 2. *Веснавы перыяд беларускага земляробчага каленадара (веснянкі, валачобныя песні, Юр’я).*

Багацце і жанравая разнастайнасць веснавых песен: вяснянкі-заклічкі, велікодныя, валачобныя, юраўскія. Характарыстыка і матывы вяснянак. Вобраз вясны.

Валачобныя песні - класічны жанр беларускага эпічнага фальклору. Багаты раздзел календарнай паэзіі. Спецыфіка і нацыянальная адметнасць, непаўторнасць, тыпавыя сюжэты валачобных песен. Вобразы святых у валачобных песьнях. Пачцівасць валачобнікаў да гаспадара, гаспадыні. Услаўленне дзяўчыны і хлопца, бабкі.

Юр’я. Юраўскія песні – старадаўняе земляробчае свята першага абрадавага выгану жывёлы ў поле. Цэнтральны вобраз юраўскіх песен – Юр’я, Юрай.

Тэма 3. *Пазаабрадавая паэзія (жартоўныя песні).*

Жартоўныя песні – важная частка народнай вусна-паэтычнай творчасці, духоўны скарб нацыянальнай культуры беларусаў. Жартоўныя песні і скамарохі (перыяд Кіеўскай Русі і фарміраванне трох братніх народнасцей – рускіх, украінцаў і беларусаў).

Асноўныя тэмы жартоўных песен і іх галоўныя персанажы. Жартоўная песня - крыніца вобразаў, сюжэтаў, тэм для кампазітараў.

Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Суправаджэнне народных песен своеасаблівымі рухамі.

Тэма 4. *Казкі, загадкі.*

Загадкі – старажытны жанр фальклору. Тэрмін “загадка”. Іншасказальнае, метафарычнае апісанне прадмета. Адлюстраванне багатага гаспадарчага і жыццёвага вопыта ў загадках. Фантазія, кемлівасць, дасціпны гумар народа, яго паэтычныя здольнасці.

Тэматыка загадак: шматгранны свет прадметаў і з’яў навакольнай рэчаіснасці (з’явы прыроды; чалавек і яго працоўная дзейнасць; матэрыяльны быт, сацыяльныя адносіны; жывёльны і раслінны свет). Тыповы час загадвання і адгадваннея загадак. Дыдактычна-павучальны сэнс загадак.

Казка як мастацкі твор сацыяльна-бытавога, фантастычнага або навелістычна-авантурнага зместу. Класіфікацыя беларускіх казак: а) аб жывёлах; б) чарадзейныя; в) сацыяльна-бытавыя.

## VI клас.

Тэма 5. *Калядныя песні (калядкі, масленка).*

Праца як аснова каляндарнай паэзіі. Музычная характарыстыка каляндарнага цыкла. Традыцыі выканання калядных песен. Асноўны сэнс калядак, іх функцыі.

Масленіца. Святкаванне масленіцы на Беларусі (катанне з гор і на арэлях). Сімвалы чучала і бліна. Мелодыка масленічных песен. Выкананне як без суправаджэння, так і з суправаджэннем (па выбару настаўніка).

Тэма 6. *Веснавы перыяд земляробчага календара (веснавыя карагоды, карагодныя песні).*

Каларытнасць веснавых карагодаў. Старажытны карагод “А мы ляда капалі”. Змест карагодных песен.

Рухі “кола”, “сценка на сенку”, “ланцужок”.

Тэма 7. *Летні перыяд земляробчага календара (Купалле).*

Купалле. Купальскія песні – гімн жыццю, прыродзе, каханню. Старажытныя карані. Купалінка (Купалка) як галоўны вобраз абраду. Крытэрыі працавітасці, сумленнасці, ветлівасці. Купальская паэзія: розныя праявы народнага быту, старадаўняга земляробчага светаўспрымання. Балады і баладныя матывы ў купальскіх песнях. Жартоўная песня ў купальскай паэзіі. Высмейванне непраўдзівасці, няшчырасці хлапцоў. Разнастайнасць мастацкіх прыемаў, эканомнасць і выразнасць паэтычнага выказвання ў купальскіх песнях. Роля гульняў, карагодаў ў купальскай урачыстасці.

Сінкрэтычнасць музычнага фальклора. Спевы, акцёрская гульня, скокі, ці іншыя элементы руха.

Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Тэма 8. *Прыказкі і прымаўкі.*

Прыказка – устоўлівы народны выраз-афарызм, абагульняючы шматвекавы жыццёвы вопыт народа. Пераносны сэнс прыказак. Прымаўка – устойлівы народны выраз. Уласцівасці прымаўкі – жарт, сатыра, гумар.

## VII клас.

Тэма 9. *Веснавы перыяд земляробчага календара (траецкія і русальныя песні).*

Тройца (Сёмуха) і русальны тыдзень – позневеснавыя святы земляробчага календара. Раёны распаўсюджвання. Культ расліннасці. Завіванне вянкоў. Сімвал бярозы. Роля траецкіх песен у традыцыйным песенным рэпертуары. Разнавіднасць траецкіх песен (куставыя).

Русальны (гранны) тыдзень. Народная міфалогія. Старадаўнія ўяўленні аб русалках.

Тэма 10. *Летні перыяд земляробчага календара (пятроўскія песні, жніўныя песні – зажынкі).*

Адлюстраванне ў абрадавай паэзіі асноўных этапаў жыцця чалавека, яго прыродапазнавальнай і працоўнай дзейнасці. Асноўныя раздзелы абрадавай паэзіі.

Пятро як своеасаблівы працяг Купалля. Любоўная і сямейна-бытавая тэматыка пятроўскіх песен. Функцыянальная роля пятровак, іх бытавое прызначэнне. Руплівась – характэрная рыса пятроўскіх песен.

Зажынкавыя песні. Клопат аб тым, каб жніву паспрыяла добрае надвор'е. Радасць сустрэчы жней з нівай. Вобразна-паэтычны пачатак песеннага дыялога жней з полем. Адлюстраванне радасці з выпадку зажынак у застольных зажынкавых песнях.

Тэма 11. *Пазаабрадавая паэзія (гістарычныя і баладныя песні).*

Паняцце пазаабрадавых песен. Тэматыка і ўмовы выканання пазаабрадавых песен. Праяўленне ў песнях лепшых рыс нацыянальнага характару беларусаў: шчырасці, праўдзівасці, працавітасці, гасціннасці, гуманнасці, чуласці, сціпласці. Пазаабрадавыя песні (гістарычныя і баладныя).

Адлюстраванне гістарычных падзей, адносін народа да гэтых падзей у гістарычных песнях. Значнае месца песен пра татарскі палон, барацьбу з польска-каталіцкай агрэсіяй (пра Слуцк, Магілёў), пра Палтаўскі бой і вайну 1812 года, песні пра падаўленне польскага паўстання 1831 года і яго кіраўніка Т.Касцюшку ў беларускім музычным фальклоры. Шырокае распаўсюджванне салдацкіх і гістарычных песен.

Балады, або баладныя песні – ліра-эпічныя творы з драматычна-напружаным сюжэтам. Пабудава балады. Тэрмін “балада” і яго станаўленне. “Доўгія песні”, або “смутныя” і “жаласныя”. Выкананне часцей у вялікі пост. Пераўтварэнне чалавека ў расліну ці птушку (купальскія балады). Класіфікацыя балад:

Скачено с Образовательного портала www.adu.by

- з міфалагічнымі матывамі;
- казачныя і легендарныя;
- якія змяшчаюць загадкі;
- гульнёва-карагоднага складу;
- навелістычныя.

Выкананне гістарычных і баладных песен з суправаджэннем старадаўніх музычных інструменітаў (дуда, ліра, басэтля, акарына, саломка).

Народныя песні без суправаджэння – галоўная рыса народнага выканальніцтва.

Песні Беларускага Палесся. Багатая меладычная палітра, змястоўны паэтычны тэкст, вялікая мастацкая каштоўнасць.

Тэма 12. *Легенды і паданні.*

Месца легендаў і паданняў сярод жанраў вусна-паэтычнай прозы. Фантастычныя і апаэтызаваныя вобразы легенд. Пазнавальная функцыя легенд. Легенды гістарычнага зместу. Легенды этыялагічнага (тлумачальнага) зместу: пра паходжанне свету, зямлі, неба, чалавека, розных жывёл і раслін.

Паданні. Асноўныя сюжэты. Пазнавальная функцыя паданняў. Гістарычныя паданні як найбольш распаўсюджаныя ў беларускім фальклоры (аб волатах, крыжаносцах, барацьбе з татара-мангольскім нашэсцем і супраць шведаў, Айчыннай вайне 1812 года). Тапанімічныя паданні, іх галоўныя тэмы (аб паходжанні населеных пунктаў, урочышчаў, азёр).

**VIII клас.**

Тэма 13. *Пазаабрадавая паэзія (рэкруцкія і жартоўныя песні).*

Элегічнасць зместу і глыбокі сум рэкруцкіх песен. Набор, як драматычны момант ў рэкруцкіх песнях. Вобразы сям’і (бацька, маці, удава, сёстры, браты, конь і г.д.), невыносная служба, смерць салдата – тыпавы момант.

Выкарыстанне барабана і духавых інструментаў у рэкруцкіх песнях.

Жартоўныя песні як важная частка беларускай народнай вусна-паэтычнай творчасці. Глыбіня зместу і паўнакроўнасць паэтычных вобразаў жартоўнай песні.

Праяўленне здаровай натуры беларускага працаўніка, яго маралі і вялікага жыццялюбства ў жартоўных песнях. Тэма “прымака” – вясёлыя і ўдалыя людзі, і іх расказ пра сябе. Адмоўныя з’явы з сямейнага побыту, адхіленне ад усталяваных у грамадстве норм маралі, узаемаадносіны паміж людзьмі ў поле зроку стваральнікаў народнага гумару. Класічныя творы жартоўнай лірыкі - песні пра жонку-недарэку, песні-небыліцы пра камара і муху. Алегарычны сэнс вобразаў песен; высмейванне легкадумнасці, безразважлівасці людзей. Смех – магутная ачышчальная сіла.

Песні Беларускага Палесся: багатая меладычная палітра, змястоўны паэтычны тэкст, вялікая мастацкая каштоўнасць.

Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Тэма 14. *Прыпеўкі.*

Прыпеўка: асаблівасці пабудовы і зместу. Варыятыўнасць ўжывання тэкстаў адносна аднаго меладычнага малюнка (матыва). Варыятыўнасць ужывання мелодыі адносна аднолькавага тэксту. Хуткае рэагаванне прыпевак на шматлікія з'явы жыцця. Блізасць тэматыкі прыпевак да тэматыкі традыцыйнай пазаабрадавай песні. Мастацкія сродкі прыпеўкі.

Выконванне прыпевак у суправаджэнні гармоніка.

Спецыфіка выкарыстання народных песен з элементамі руху. Асноўныя элементы беларускага народнага танца. Асноўныя запісы танцавальнага фальклору і іх выкарыстанне кіраўнікамі фальклорных гурткоў. Выконванне вакальна-харэаграфічных кампазіцый па матывах песен каляндарна-абрадавага цыкла.

Тэма 15. *Летні перыяд земляробчага календара (жніўныя песні).*

Жніво - асабліва важны этап у гаспадарчай дзейнасці земляроба. Падвядзенне вынікаў працоўнага года. Саступленне места звычаямі і цэрымоніямі цяжкай напружанай працы. Час выконвання жніўных песен. Дажынкі (заключны этап жніва): асабліва пышны і ўрачысты абрад. Незлічоная колькасць дажынкавых песен. Галоўная тэма дажынак - тэма радасці з выпадку заканчэння жніва. Услаўленне ўраджаю, узвялічванне, падвышэнне годнасці гаспадара і гаспадыні ў дажынкавых застольных песнях.

Мэтазгодга пачынаючы з гэтых песень уводзіць вывучэнне манеры выканання, вывучэнне дыялектаў.

Тэма 16. З*амовы.*

Вера народа ў магічную сілу замоў. Узнікненні, бытаванне замоў (строгая рэгламентацыя). Разнастайнасць замоў па змесце і прызначэнні: 1) замовы гаспадарчага прызначэння; 2) замовы ад розных хвароб; 3) замовы, звязаныя з сямейнымі адносінамі і прыватным бытам; 4) замовы, звязаныя з грамадскімі адносінамі. Рэальныя вобразы ў замовах (сонца, месяц, зоры, поле, лес, розныя жывёлы і звяры, гаспадарчыя збудаванні, жыллё, інтэр'ер і інш.). Міфалагічныя вобразы – чур, д'ябал, ведзьма, баба-яга і інш. Кола паэтычных вобразаў – крыксы, плаксы, дзеўкі-трасухі; птушкі, рыбы або проста людзі; святыя Павел, Петр, Ілля, Кузьма. Замовы – багацце эпітэтаў, адметныя сродкі паэтычнай мовы.

## IX клас.

Тэма 17. *Асенні перыяд земляробчага календара (талочныя, ільняныя песні).*

Восеньскі цыкл календарнай паэзіі. Ярынныя і ільняныя песні. Час і месца выконвання. Матывы восеньскіх песен, самабытны мелас, лірычны характар. Чыста працоўнае функцыянальнае прызначэнне восеньскіх песен.

Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Талочныя песні як песні дажынкавага застолля: радасная атмасфера заканчэння вялікай цяжкай працы, у асноўным жартоўны тон. Прадчуванне перамен у жыццёвым лёсе дзяўчыны (будучае замужжа). Паглыбленне ў свет перажыванняў чалавека, клопат за яго лёс. Заканчэнне восеньскімі песнямі гадавога круга паэзіі земляробчага календара.

Форма гульні кола: гарманічнасць, закончаннасць. Рытмічнасць праводзін гульняў. Імітацыя ў гульнях земляробчай працы чалавека, сувязь з сельскагаспадарчай дзейнасцю.

Тэма 18. *Народны тэатр (лялькавы тэатр “Батлейка”).*

Развіццё традыцый фальклору, тэатралізаваных народных абрадаў, гульняў, прадстаўленняў скамарохаў на Беларусі. Вялікая папулярнасць ў народзе прадстаўлення тэатра лялек. Рэпертуар батлейкі XVI – XVII ст. – сцэны са “свяшчэннага пісання”, на евангельскія сюжэты. Дзеючыя асобы тэатра “Батлейка”: Ісус Хрыстос, Цар Ірад, Смерць, беларускі селянін Мацей. Забаўляльная функцыя батлейкі, сцэны з народнага жыцця. Сацыяльная накіраванасць сцэнак з батлейкавага рэпертуара (высмейванне некаторых адмоўных грамадскіх з’яў, стварэнне вобразаў розных сацыяльных тыпаў). XIX ст. - нападкі са стараны царквы. Спалучэнне гумара з сатырай у батлейкавых сцэнах з народнага жыцця. Статычнасць вобразаў. Мова перасанажаў: вобразныя параўнанні, метафарычныя выразы і г.д.

Тэма 19. *Сямейна-абрадавая паэзія (велічальныя, хрэсьбінскія і жартоўныя песні).*

Сямейна-абрадавая паэзія як адзін з самых папулярных і распаўсюджаных па ўсёй Беларусі відаў народнай песеннай творчасці. Спалучэнне сямейна-абрадавай паэзіі з асноўнымі этапамі жыццёвага шляху чалавека – нараджэннем, шлюбам і смерцю, з яго працоўнай дзейнасцю і бытам. Жанрава-відавая адметнасць беларускага песеннага фальклору. Хрэсьбінскія песні (велічальныя, жартоўныя, застольна-бяседныя). Услаўленне ў велічальных песнях парадзіхі, бацькі, бабкі, кумы, кума, выказванне пажадання шчасця дзіцяці. Выразнае маляванне ў хрэсьбінскіх песнях вобразаў маці і бацькі дзіцяці. Вялікая заклапочанасць аб долі нованароджанага. Вялікая папулярнасць песен пра бабку і кумоў. Характэрныя рысы песен (жартаўлівы тон, незласлівая насмешка, дасціпны гумар).

Тэма 20. *Пазаабрадавая паэзія (сямейна-бытавыя песні).*

Асноўная тэма сямейна-бытавых песен – жыццё замужней жанчыны ў чужой сям’і. Асноўныя тэматычныя групы: песні пра гаротны замуж, песні-ўспаміны, пра бацькоўскі дом і жаданую сустрэчу з роднымі, пра бацькоў мужа (свякруху, свёкра) і пра іх дэспатычныя адносіны да нявесткі, пра няўдалага ці няроўнага мужа (жорсткага, п’яніцу ці старога), песні мужа пра жонку няўдаліцу, песні ўдавы, сірочыя песні.

Скачено с Образовательного портала www.adu.by

## ЧАКАЕМЫЯ ВЫНІКІ

- знаемства з культурнай спадчанай беларускага народа (вусна-паэтычнай творчасцю, музычным фальклорам, абрадавымі традыцыямі);
- развіццё вакальных, слыхавых і вакальна-ансамблевых навыкаў (пеўчай установкі, пеўчага дыхання, дыяпазона, гукаўтварэння і гукавядзення, пеўчай артыкуляцыі і дыкцыі, ансамбля і строю; слухання і ўзнавання характэрнага комплекса выразных сродкаў народнай музыкі і інш.);
- засваенне высокамастацкага рэпертуару, рознабаковага па зместу і жанрах;
- набыццё практычных навыкаў канцэртна-выканальніцкай дзейнасці;
- фарміраванне народна-песеннага склада мыслення;
- развіцце музычна-эстэтычнай культуры вучняў і іх мастацкага густу;
- творчая актыўнасць вучняў.

Вучні павінны **в е д а ц ь** :
- жанры беларускага земляробчага календара;
- асновы народных спеваў (спецыфіка);
- вобразы беларускай міфалогіі;
- некаторыя рысы народнай харэаграфіі.

Вучні павінны **ў м е ц ь** :
- рабіць натуральнае, блізкае да мовы гукаўтварэнне;
- спяваць натуральным звонкім голасам;
- валодаць правільным пеўчым дыханнем (ніжнероберна-дыяфрагмальным);
- вытрымліваць адзіную вакальную пазіцыю пры пераходзе ад гука да гука ў розных рэгістрах;
- выразна і адкрыта вымаўляць словы ў спевах;
- правільна вымаўляць словы на дыялектах;
- спяваць a'capella і з інструментальным суправаджэннем;
- спяваць шматгалосна (валоданне унісонна-гетэрафонным, падгалосачным, змешаным шматгалоссем);
- выконваць народную мелізматыку;
- спяваць эмацыянальна-выразна, напеўна, прыгожым (моцным, гучным і светлым) голасам;
- спалучаць пеўчае гукавядзенне з размоўнай інтанацыяй;
- граматна выкарыстоўваць музычныя сродкі выразнасці ў выкананні фальклорных твораў;
- суправаджаць спевы танцавальнымі і іншымі выразнымі рухамі;
- комплексна засвойваць фальклорны матэрыял.

Скачено с Образовательного портала www.adu.by

## РЭКАМЕНДАВАНЫ МУЗЫЧНЫ РЭПЕРТУАР

**5 клас.**

*Калядкі:* “Ішла каляда ўпярод ражства”, “Вы калядачкі, вы пабліжыцеся”, “Добры вечар, гаспадару”, “Го-го-го, каза”, “Як пайшла каляда”, “А калядачкі, а хадзіце к нам”

*Валачобныя песні*: “А з-пад лесу, лесу цёмнага”, “Дай ішлі хлопцы да полем, борам”, “Ідзём пайдзём па вуліцы”, “Няхай будзе пахвалёны”, “Там дзевачка кубкі мыла”, “Ходзіць пава па вуліцы”, “А на рэчачцы, а на быстрае”.

*Вяснянкі*: “Вол бушуе - вясну чуе”, “Вясна, вясна на калочку”, “Ой, вясна, вясна ты, вясенечка”, “Вясна красна”, “Ой, вясна, вясна, што ты прынясла?”

*Юраўскія песні*: “Юр’я! Вечар добры, Юр’я”, “Юр’я, устань рана”, “Юр’ева матка пагнала цялятка”, “Юр’я, Юр’я па полі ходзіць”, “Ой, выйду я на вулачку”, “Разгуляўся Юр’еў конь”

*Жартоўныя песні*: “Ой, паслала мяне маці”, “Хлопец пашаньку пахае”, “Чабарок, чабарок”, “А як дзед з бабай пайшоў па каліну”, “Ой, да прадай, бабушка, бычка”

Бел. нар. песня “Як з-пад нашай вуліцы”.

Бел. нар. песня “Штой на траўкі, траўкі”

Бел. нар. песня “У крывога танца”

Бел. нар. песня “Моладзец, моладзец”

Бел. нар. песня ў апрацоўцы Г.Несцяровіч “Жураўка”

Бел. нар. песня ў апрацоўцы Г.Несцяровіч “Усе гульні каля броду”

Бел. нар. песня ў апрацоўцы Л.Холупавай “Журавель”

Бел. нар. песня ў апрацоўцы Л.Холупавай “А за лесам, за барамі”

**6 клас**

*Калядкі*: “Калядкі блізка, каўбаскі нізка”, “Шчодры вечар, добры вечар”, “Прыехала каляда на белым кані”, “Добры вечар таму, хто ў етым даму...”, “Ці дома, дома сам пан гаспадар?”.

Бел. нар. песня ў апрацоўцы Ул.Зяневіча “Ой, рана, рана куры запелі”.

*Масленічныя песні*: “У нас сёння масленіца”, “А на гары сонца”

*Веснавыя карагоды*: “Пасеялі дзеўкі лён”, “А пайду па лужочку”, “Ды што ў садзе лялеіцца”, “Дзень вялік”, “Ды хадзіў карагод”, “Як пушчу стралу”

*Купальскія песні*: “Зялёная жабка”, “Купала ночка”, “А Іван свішчыць”, “Купава”. “Сягоння Купала, а заўтра Ян”, “Ішла Купалка сялом, сялом”, “На моры вутка купалась”

Бел. нар. песня “Ой, бору мой”

Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Бел. нар. песня “Як задумаў камарык жаніцца”

Бел. нар. песня “Як хадзіла дзевачка беражком”

Бел. нар. песня “Тупу, тупу на памосце”

Бел. нар. песня  “А з-пад лесіку”

Бел. нар. песня ў апрацоўцы Л.Холупавай “Сонца села”

Бел. нар. песня ў апрацоўцы Л.Холупавай “Ой, чаму ты, яліначка”

Бел. нар. песня ў апрацоўцы М.Сіраты “Як па лесе я гуляла”

Вянок купальскіх песень: “Дзе Купала начавала”, “Йшла Купалка”

**7 клас**

*Траецкія і русальныя песні*: “Ой ты, Тройца”, “Саду мой, саду зялёны”, “Ай, не радуйся, зялён дуб”, “Пойдзем, дзевачкі”, “На граной нядзелі”, “Павяду русалку”, “Ляцела вада каля горада”

*Пятроўскія песні*: “Божа наш”, “Як з двара”, “Перад Пятром, пятым днём”

*Зажынкі*: “Радзі поле жыта”, “Гаварыла поле шырокае”, “Пойдзем дзеўкі”, “Радзі сонца жыта і пшаніцу”

Бел. нар. песня “Ой, зіма, зіма”

Бел. нар. песня “Ай, барком, барком”

Бел. нар. песня ў апрацоўцы М.Сіраты “Ой, ты белая бяроза”

Бел. нар. песня ў апрацоўцы С.Беражнога “Дубравушка”

Бел. нар. песня ў апрацоўцы Л.Холупавай “Зорачка”

Бел. нар. песня ў апрацоўцы Л.Холупавай “А на гарэ жыта, пад гарой пшаніца”

Бел. нар. песня ў апрацоўцы Г.Цітовіча “Жавароначкі, прыляціці”

Бел. нар. песня ў апрацоўцы Л.Ражковай “Ой, на гарэ мак”

Сл. Р.Барадуліна, муз.М.Хаухлянцава “Вочы Беларусі”

**8 клас**

*Рэкрутскія песні*: “Ой з-пад лесу лесу цёмнага”, “Ой, ляцелі гусанькі”

*Жартоўныя песні*: “Ой, у полі крынічанька”, “Ой, паслала мяне маці”, “Хлопец пашаньку пахае”, “Спарадзіла чачотачка семера дачок”.

*Жніво*: “Відзіць вочка, што край недалёчка”, “Да пара маці, да ячменю жаці”, “Да мы жалі не ляжалі”, “Што за ельнічкам”, “Яркае сонца за бор, за бор”

Бел. нар. песня “Ой ты, ціхі Дунай”

Бел. нар. песня “Як пайду я на ту гору”

Бел. нар. песня “Ой, у лузе”

Скачено с Образовательного портала www.adu.by

Бел. нар. песня ў апрацоўцы М.Сіраты “Прасіўся снапочак”

Бел. нар. песня ў апрацоўцы М.Сіраты “Пакаціўся туман”

Бел. нар. песня ў апрацоўцы К.Паплаўскага “На купалле”

Бел. нар. песня ў апрацоўцы А.Рашчынскага “Пасеялі дзеўкі лён”

Бел. нар. песня ў апрацоўцы Л.Ражковай “А ў кусце, кусце”

Вянок купальскіх песень “Іван ды Мар’я”.

Сл. М.Багдановіча, муз.М.Сіраты “Бяседная”

**9 клас**

*Талочныя песні*: “Талака, талака не ўняць”, “Як ішлі мы з талакою”, “Таўкучы, мелючы, запылілася”, “А знаць наш бацюшка багата жывець”, “На гары лён”

*Хрэсьбінскія песні*: “Цераз рэчачку, цераз быструю”, “Ой, дымна, дымна ў садзе”, “Раса пала на травіцу”, “Не стук стучыць”, “Бабуля к унучцы сабіралася”, “Кума мая, кумачка”, “Ой, кум да кумы заляцаўся”, “Час да дому, час”

*Сямейна-бытавыя песні*: “Ой, за бор, за бор сонца коціцца”, “Чырвоная каліначка”, “Ой, зелена, зелена”, “Як пайду я ў каморачку”, “Вярба, вярба дзе ж ты расла”, “О, не кукуй, зязюленька, рана”

*Жартоўныя песні*: “Пасеяў мужык грэчку”, “Было ў цешчы сем зяцёў”, “Чаму ж мне не пець”, “А мой мілы захварэў”.

Бел. нар. песня “Ой там на гарэ”

Бел. нар. песня “За гарою каліна стаяла”

Бел. нар. песня ў апрацоўцы А.Шагава “Каліна-маліна”

Бел. нар. песня ў апрацоўцы М.Корсака “Бела чаечка”

Бел. нар. песня ў апрацоўцы М.Сіраты “Цераз бор-бары”

Бел. нар. песня ў апрацоўцы М.Сіраты “А ў нас сёння дажыначкі”

Бел. нар. песня ў апрацоўцы А.Кулакоўскай “Смутны вечар”

Бел. нар. песня ў апрацоўцы Ул.Зяневіча “Як выведзем луку”

Бел. нар. песня ў апрацоўцы В.Рамановіча “А ў сенях, сенях”

Калядныя гульні ў апрацоўцы М.Сіраты

Русальныя гульні ў апрацоўцы М.Сіраты

## РЭКАМЕНДАВАНАЯ ЛІТАРАТУРА

1. Барташэвіч Г. Беларуская народная паэзія веснавога цыкла і славянская фальклорная традыцыя. Мн., 1985.

Скачено с Образовательного портала www.adu.by

2. Беззубов Г.И. Вокально-хоровые упражнения для детского и юношеского хора // Из опыта хоровой работы с детьми / Ред. Локшин М., 1953.
3. Виноградов Г. Работа над дикцией в хоре. М., 1967.
4. Виноградов Г. Детский фольклор (“Из истории русской фольклористики”) Л., Наука, 1978
5. Детский хор. Пособие для хормейстера / Сост. В.Соколов. М., 1981.
6. Добровольская Н. Распевание в детском хоре. М., 1988.
7. Добровольская Н., Орлова Н. Что надо знать учителю о детском голосе. М., Музыка, 1972.
8. Емельянов В. Развитие голоса: координация и тренаж. Спб., 1997.
9. Куприянова Л. Основные принципы работы с детскими народно-хоровыми коллективами. (Методиские рекомендации). М., ВНМЦНТи КПР, 1981.
10. Менабени А. Методика обучения сольному пению. М., 1987
11. Огороднов Д. Музыкально-певческое воспитание детей. Киев, Музична Украина, 1981
12. Сорокин П. Формирование репертуара детского народно-хорового коллектива. (Методические указания), М., ВНМЦНТи КПР, 1984.
13. Струве Г.А. Школьный хор. М., Просвещение, 1981
14. Стулова Г. Хоровой класс. М., 1988.
15. Тавлай Г. «Белорусское купалье», Мн., 1986.
16. Шамина Л. Работа с самодеятельным коллективом. – М., Музыка, 1983.

ЗБОРНІКІ

1. Аляхновіч А. Беларускі дзіцячы фальклор. – Мн., Беларусь, 1994.
2. Аляхновіч А. Беларускі музычны фальклор. – Мн., Універсітэцкае, 1996.
3. Варфаламеева Т. Песьні Беларускага Панямоння. – Мн: Бел.навука, 1998
4. Мажэйка З., Варфаламеева Т. Песьні Беларускага Падняпроўя. Мн.: Бел.навука, 1998
5. Мажэйка З. Песні Беларускага Паазер’я. – Мн.: Навука: тэхніка, 1981.
6. Балады. – Мн.: Навука і тэхніка, 1987.
7. Беларускі фальклор у сучасных запісах. (Гомельская вобл.). Мн., Універсітэцкае, 1989.
8. Веснавыя песні. Мн., Навука і тэхніка, 1979.
9. Валачобныя песні. Мн., Навука і тэхніка, 1980.
10. Восеньскія і талочныя песні. Мн., Навука і тэхніка, 1981.
11. Вяселле. – Т.2. – Мн.: Навука і тэхніка, - 1981.
12. Жартоўныя песні. Мн., Навука і тэхніка, 1974.
13. Жніўныя песні. Мн., Навука і тэхніка, 1974.

Скачено с Образовательного портала www.adu.by

14.Замовы. – Мн.: Беларуская навука. – 2000.
15.Зімовая песні. Мн., Навука і тэхніка, 1975.
16.Купальскія і пятроўскія. Мн., Навука і тэхніка, 1985.
17.Легенды і паданні. – Мн.:, Навука і тэхніка. – 1983.
18. Народны тэатр. – Мн.: Навука і тэхніка, -- 1983.
19.Паэзія беларускага земляробчага календара. Мн., Навука і тэхніка, 1991.
20.Прыказкі і прымаўкі. – Мн.: Навука і тэхніка, -- 1976.

Скачено с Образовательного портала www.adu.by